**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народнай песні «Скарыначка» ўстановы «Урыцкі рэгіянальны цэнтр культуры і вольнага часу Гомельскага раёна»**

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народнай песні «Скарыначка» сваю творчую дзейнасць пачаў у 1986 годзе. Стваральнікам і пастаянным кіраўнікам з'яўляецца Віктар Аляксандравіч Кавалёў.

Калектыў ансамбля яркі, самабытны, захоўвае беларускую нацыянальную культуру, дорыць гледачам магчымасць дакрануцца да песеннага багацця сінявокай Беларусі.

У рэпертуар калектыву ўваходзяць лепшыя ўзоры песеннай творчасці. Іх аснову складаюць апрацоўкі беларускіх народных песень, творы беларускіх кампазітараў, уласныя аўтарскія песні. Рэпертуар калектыву рэгулярна папаўняецца. Ансамбль адрозніваецца высокім выканаўчым майстэрствам, вакальнай культурай, непаўторнасцю гучання.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народнай песні «Скарыначка» прымае актыўны ўдзел у канцэртнай дзейнасці. Ён – пастаянны ўдзельнік гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх фестываляў і аглядаў-конкурсаў.

З творчымі выездамі пабывалі ў бліжнім замежжы: Масква, Талін, Рыга, Вялікі Ноўгарад і Сальцы, Бранск, Трубчэўск, Клімаў, Сеўск, Сланцы (Ленінградская вобласць).

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народнай песні «Скарыначка» мае шмат узнагарод. З'яўляецца дыпламантам: раённых конкурсаў і фестываляў: Міжнароднага фестывалю народнага мастацтва і рамёстваў «Садко» г. Вялікі Ноўгарад (Расія), раённага конкурсу патрыятычнай песні і музыкі «Поклонимся великим тем годам», лаўрэатам XIII Міжнароднага фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік» г. Паставы, дыпламантам абласнога IX Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур (г. Рагачоў), лаўрэатам IX Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур (г. Гродна), дыпламантам абласнога IX Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур (г. Рагачоў), абласнога свята-кірмаша «Хобби-

Бум» (г. Гомель), лаўрэатам X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур (г. Гродна).

Узнагароды і званні павышаюць узровень калектыву, але галоўнае для калектыву – прапаганда народнай песеннай творчасці, магчымасць радаваць людзей сваёй дзейнасцю.

Дзякуючы ініцыятыўнасці і прафесійнасці кіраўніка калектыў набыў самабытны каларыт, які вылучае яго сярод іншых харавых калектываў Гомельскай вобласці.

